*1. Конституция* Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями). –Мн.: Амалфея, 2002. – 48 с.

*2. Лаптенок С.Д.* Духовно-нравственный мир учащейся молодежи. – Мн.: Амалфея, 2001. – 176 с.

*3. Обращение* Президента А.Г.Лукашенко с ежегодным посланием к белорусскому народу и парламенту // Советская Белоруссия. – 2004. – 17 апр. – С.3–6.

*4. Правовые* основы взаимодействия учреждений образования с религиозными организациями в Республике Беларусь / под общ. ред. А.В.Бройко. – Мн.: МИУ, 2002. – 103 с.

**А.Г.Хаменка,** *аспірант*

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СВЯТЫ І СУЧАСНЫ ІДЭАЛАГІЧНЫ ПРАЦЭС

Матэрыялаў, інфармацыйных артыкулаў, розных інтэрнэт-форумаў на тэму сучаснай ідэалогіі зараз можна знайсці вельмі шмат. У першую чаргу гэта звязана з тым, што з 2004/2005 навучальнага года студэнты вышэйшых навучальных устаноў РБ павінны вывучаць "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы".

Калі звярнуцца да матэрыялаў інтэрнэт-форуму на тэму "Дискуссия по вопросам идеологии белорусского государства" на сайце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, то заўважаем, што рэспандэнтаў можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Прыхільнікі першай разважаюць пра ідэалогію з боку эканамічных праблем развіцця, якія павінны садзейнічаць развіццю сістэмы каштоўнасцей, забяспечыць трываласць і заможнасць грамадства. Прыхільнікі другой лічаць, што падмурак ідэалогіі – сфера духоўная і трэба грунтавацца на "просвещённом белорусском национализме." Але і тыя, і другія нярэдка атаясамлі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваюць паняцці патрыятызму і ідэалогіі, што, безумоўна, розныя рэчы.

Трэба адзначыць, што ў пытаннях да заліку па "Асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы" няма ніводнага ўспаміну пра культуру ці ўзаемасувязь культурных традыцый як каштоўнасных арыенціраў і ідэалогіі. Прывядзём цытату доктара палітычных навук, прафесара, сааўтара падручніка "Асновы ідэалогіі беларускай дзяражавы" С.В.Рашэтнікава: "Идеология белорусского государства – это учение о нормах жизни, идеалах и ценностях белорусского народа, о государственных институтах, осуществляющих идеологическую политику, и об идеологических процессах, характеризующих цели и особенности белорусского пути общественного развития. То есть в основе идеологии лежат наша ментальность, идеалы, ценности белорусского народа, а идеологические институты государства с учётом этих ценностей вырабатывают государственную политику в области экономики, социальной сферы, культуры..." І яшчэ: "...какая она – национальная идея? – Это вопрос, на который пока нет однозначного ответа..." [http://belta.press.net.by]. Да гэтага трэба дадаць, што ў адрозненне ад грамадскай псіхалогіі з яе стыхійным адлюстраваннем рэчаіснасці ідэалогія будуецца свядома, яе выпрацоўваюць палітыкі і ідэалагічныя дзяржаўныя інстытуты.

На аснове сказанага паспрабуем высветліць, ці з'яўляюцца традыцыйныя нацыянальныя святы (святочна-абрадавыя комплексы) традыцыйнымі нацыянальнымі каштоўнасцямі. Згодна прыведзенай цытаце С.В.Рашэтнікава, менавіта гэтыя каштоўнасці ўплываюць на ідэалагічную палітыку ў галіне культуры.

Святочныя традыцыі, безумоўна, павінны быць трывалымі традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускай культуры. Але галоўная спрэчка, прычым нярэдка з палітычнай афарбоўкай, узнікае тады, калі спрабуюць вызначыць, ці з'яўляецца, напрыклад, свята Першамая беларускім, нацыянальным або

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнай каштоўнасцю. Падобнае становішча і са святам чарговай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Станоўчае, але не вельмі дакладнае пытанне і па святкаванні Каляд, Новага года, Ражства. На галоўнай плошчы сталіцы вісела віншаванне: "З Новым годам" і побач: "З Ражством і Калядамі". Такім чынам падкрэслівалася раўназначнасць хрысціянскага, народнага і дзяржаўна-каляндарнага свят. Але па пытанні, ці будзе 25 снежня "чырвоным днём календара", спрэчкі працягваюцца. Гістарычныя ўмовы склаліся так, што традыцыі дзяржаўнага свята жанчын, 8-га Сакавіка, значна больш вядомыя, чым традыцыі святкавання Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь ці Дня рэспублікі, даты святкавання якіх не ўсе ведаюць. У 80-я і 90-я гг. XX ст. былі спрэчкі аб тым, ці збіралася Камуністычная партыя падмяніць свята Пасхі святам Першамая. Водгук гэтых спрэчак адчуваецца і зараз. Сёння вельмі складана разважаць пра традыцыйнасць і нацыянальную каштоўнасць свята Перамогі. Ці карэктна параўноўваць Вялікую Перамогу з традыцыйным спрадвечным абрадам ушанавання памяці ўсіх памерлых – Дзядамі? Або свята вызвалення Беларусі са святам Радаўніцы, калі насуперак царкоўным забаронам і насуперак (ці дзякуючы) беларускай ментальнасці нясуць гарэлку і ежу на магілкі, каб ушанаваць светлую памяць памерлых?

Параўноўваць ці супрацьпастаўляць гэтыя святы нельга, у першую чаргу таму, што адно з іх – традыцыйна-народнае, а другое – палітыка-гістарычнае.

Узважыць значнасць, аксіялагічную магутнасць гэтых свят з улікам гістарычна-культурнай перспектывы надзвычай неабходна. Зрабіць гэта павінны не толькі ідэолагі і палітыкі, але і навукоўцы, грамадазнаўцы, культуролагі і, на нашу думку, дэпутаты як прадстаўнікі народа. Самым яскравым прыкладам гэтай праблемы з'яўляецца імгненная (адносна гістарычнай працягласці часу) трансфармацыя народнага земляробчага свята заканчэння жніва "Дажынкі" ў дзяржаўнае свята ўраджаю. Тут захаваліся адзнакі абраду – вянкі з каласоў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вясёлыя песні, ушанаванне гаспадара, гасцінныя пачастункі, што само па сабе нядрэнна, але зараз гэта земляробчае свята з'яўляецца значна большай "беларускай каштоўнасцю", чым, напрыклад, усенароднае старажытнае свята ўраджаю "Багач", якое аб'яднала хрысціянскае свята нараджэння Божай маці і традыцыйнае свята "сонечнага крыжа".

Падобных пытанняў па ўзважанасці і значнасці дзяржаўных, грамадскіх, прафесійных, хрысціянскіх, традыцыйных, народных беларускіх, нетрадыцыйных, але ўжо вельмі папулярных, як, напрыклад, Хэлоўін ці дзень Святога Валянціна, вельмі шмат. Стыхійныя, непрадуманыя спробы карыстання неабгрунтаванай (ці зручнай) ідэалогіяй прывядуць да яшчэ большай блытаніны і напружанасці ў грамадстве.

У адпаведнасці з думкай С.В.Рашэтнікава ў аснове ідэалогіі павінны ляжаць ідэалы і каштоўнасці беларускага народа, якія вызначаюць палітыкі і ідэолагі, а ідэалагічныя інстытуты з улікам гэтых каштоўнасцей выпрацоўваюць дзяржаўную палітыку ў культуры і эканоміцы. Такім чынам, нацыянальная культура праз сістэму зручных каштоўнасцей павінна не ўплываць, а абслугоўваць дзяржаўную палітыку і ідэалогію.

У артыкуле "В поисках общих ценностей" у газеце "Рэспубліка" (4 мая 2004 г.) адзначаецца, што "...асноўнай умовай магутнасці і стабільнасці кожнай дзяржавы з'яўляецца з'яднанае грамадства, якое трымаецца на ўласных духоўных каштоўнасцях і спрадвечных традыцыях. Дасягнуць гэтага магчыма толькі пры наяўнасці адзіных грамадска-палітычных ідэалаў, якія грунтуюцца на маральных асновах, гістарычных і этнічных традыцыях, пачуцці нацыянальнага гонару, павагі да дзяржавы і індывіда. Фарміраванне гэтых рыс нацыянальнага характару з'яўляецца асноўнай справай сучаснай ідэалогіі".

Можна пагадзіцца са сцвярджэннем, што ролю ідэалогіі магчыма параўнаць з роляй імуннай сістэмы ў жыццяздольнасці арганізма. Дзяржаўная ідэалогія дазваляе людзям розных поглядаў усвядоміць агульныя каштоўнасці, знайсці агульныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мэты, працаваць разам у адным напрамку. Спробы існавання дзяржавы без ідэалогіі вядуць да аслаблення механізмаў кіравання, абвастрэння сацыяльна-эканамічных адносін, заняпаду традыцыйных духоўных каштоўнасцей.

Сучасныя складаныя пытанні пошуку новых агульнаграмадскіх каштоўнасцей узніклі ў выніку знікнення шматлікіх сувязей паміж дзяржавай і грамадствам, якія адбыліся ў перыяд заняпаду камуністычнай дзяржаўнай ідэалогіі. І з часоў разбурэння СССР гэтых пытанняў стала не менш, а больш. Змяніліся адносіны да царквы, царкоўных свят і агульнахрысціянскіх каштоўнасцей, да ідэй і ідэалогіі, якую прапанавала Камуністычная партыя. Грамадства імкнецца аднавіць узровень і значнасць традыцыйных народных свят, што таксама павінна паўплываць на сучасную ідэалогію краіны, на стаўленне ідэалагічных інстытутаў да значнай колькасці свят.

Сённяшні перыяд станаўлення агульнанацыянальнай беларускай ідэалогіі павінен быць, з улікам вышэйадзначанага, звязаны з пошукам і выпрацоўкай новай сістэмы нацыянальных каштоўнасцей, якая павінна ўспрыняць агульнаславянскія, а магчыма і агульнасусветныя арыенціры і дадаць да іх вызначаныя “особенности белорусского пути общественного развития”. Перад гэтым айчынныя навукоўцы павіны абавязкова сфармуляваць, што ёсць і якой павінна быць нацыянальная ідэя. Ідэалогія, пабудаваная на такой сістэме, будзе не толькі жыццяздольнай, але і будзе садзейнічаць інтэграцыі этнічных інтарэсаў з інтарэсамі розных сацыяльных груп, палітычных аб'яднанняў краіны. Аксіялагічныя распрацоўкі беларускай ментальнасці і этналогіі з улікам агульнаславянскіх і агульнаеўрапейскіх каштоўнасных сістэм дазволяць стварыць аснову для ўзнікнення ідэалогіі, якая магла аб’яднаць розныя сацыяльныя светапогляды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ